4. Ролевые игры живого действия (LARP) [Электронный ресурс] // Википедия. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/. – Дата доступа: 13.11.2018.

5. *Тимонина, Е.* Центр белорусской драматургии привлек LARP-культуру к исследованию пьес [Электронный ресурс] / Е. Тимонина // Центр белорусской драматургии: о театре. – Режим доступа: http://oteatre.info/tsentr_belorusskoj_ dramaturgii/. – Дата доступа: 15.11.2018.

6. *Чехов, А. П.* Чайка / А. П. Чехов // Избранные сочинения / редкол.: Г. Беленький [и др.] ; сост., вступ. ст. З. Паперного ; примеч. Е. Сахаровой. – М. : Худож. лит., 1988. – 639 с.

***А. І. Бабко,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі*
*і метадалогіі гуманітарных навук*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ФІЛАСОФСКІХ ТРАДЫЦЫЙ У ДЫНАМІЦЫ МІЖКУЛЬТУРНЫХ СТАСУНКАЎ

Творчая энергія чалавецтва выяўляецца ў разнастайных формах – індывідуальных, субкультурных, нацыянальных, цывілізацыйных. Згаданая разнастайнасць яскрава засведчыла каласальную магутнасць іманентнага крэатыўнага патэнцыялу чалавечага грамадства. Акрамя таго яна выступае як аснова для разгортвання дыялагічных зносін (індывідуальных і калектыўных) суб’ектаў культуратворчасці, уласцівае ёй глыбокае ўнутранае адзінства дазваляе носьбітам розных традыцый дасягаць узаемаразумення і ўзаемаўзбагачэння ў працэсе і ў выніку плённых кантактаў. Відавочна, што такога кшталту ўзаемадачыненні з’яўляюцца ў найвышэйшай ступені неабходнымі не толькі для непасрэдна задзейнічаных у іх бакоў, але і для паспяховага развіцця агульначалавечай культуры.

Згаданая неабходнасць не здзяйсняецца, аднак, аўтаматычна і беcперашкодна. Выхад у індывідуальнае, адметнае існаванне, які з’яўляецца неад’емным аспектам самарэалізацыі агульначалавечага крэатыўнага пачатку, стварае глебу не толькі для стасункаў, адзначаных пячаткай гуманізму, салідарнасці, супрацоўніцтва, але і для нецярпімасці, узаемнай нянавісці, вара-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гавання. Справа ў тым, што момант «рэфлексіі ў сябе», звязаны з індывідуальнасцю і суб'ектыўнасцю, можа набыць (і, на жаль, нярэдка набывае) аднабаковы, эгаістычны характар. Таму і паўстаюць міжкультурныя супярэчнасці і канфлікты (і на індывідуальным, і на калектыўным узроўнях).

Філасофія, як і іншыя культурныя сферы, характарызуецца плюральнасцю, наяўнасцю разнастастайных канцэпцый, школ і кірункаў. Іх узаемадзеянне мае структуру, па сутнасці ідэнтычную той, што выяўляецца ў стасунках культурных традыцый, якія здзяйсняюцца ў іншых абсягах культуратворчасці. На мове дыялектыкі яе найважнейшую, вызначальную рысу можна акрэсліць як адзінства рознага (ці рознасць у адзінстве), якое – цалкам у згодзе з дыялектычнымі прынцыпамі – дапускае спаборныя формы разгортвання адпаведных дачыненняў і не выключае магчымасці іх абвастрэння да антаганістычнага ўзроўню. (Наколькі моцны рэфлекс адштурхоўвання іншага пункту гледжання можа быць убудаваны ў самое ядро пэўнай філасофскай плыні, яскрава дэманструе савецкая сталінісцкая версія марксізму.)

Разам з тым, філасофія вылучаецца сярод культурных формаў сваім дыялагічным патэнцыялам, сваёй здольнасцю спрыяць разгортванню плённых міжкультурных кантактаў, неабходнасць якіх для паспяховага развіцця культуры была пастуляваная ў пачатку дадзенага тэксту. Гэты патэнцыял, як сведчыць даведзенае вышэй, далёка не заўжды зрэалізоўваецца поўнасцю. Каб паслядоўна і арганічна задзейнічаць яго (як ва ўласна філасофскім абсягу, так і ў агульнакультурным кантэксце), патрэбна мэтанакіравана працаваць у адпаведным кірунку і прыкласці значныя намаганні. (Дадзены момант ясна ўсвядомілі і зрабілі максімай сваёй даследчай дзейнасці прыхільнікі такой плыні ў сучаснай філасофскай думцы, як міжкультурная філасофія.)

Згаданым патэнцыялам філасофскае пазнанне валодае дзякуючы сваёй адметнай рэфлексіўна-крытычнай натуры: яно мусіць быць звернута да аналізу і праверкі як уласных першаасноў, так і падстаў культуратворчаці ўвогуле. Засяроджанасць філасофскага мыслення менавіта на першапачатках і першапрынцыпах пазнання і практыкі мае грунтоўнае значэнне ў кантэксце яго (сама)ідэнтыфікацыі, бо рэфлексія як такая ў той



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ці іншай ступені ўласцівая ўсім сферам чалавечай дзейнасці. (Рэфлексіўны характар кожнага тэарэтычнага ці практычнага абсягу робіцца ў Ж. Дэлёза і Ф. Гватары падставай для абвяржэння тэзы, згодна з якой адмысловай уласцівасцю філасофіі з'яўляецца яе рэфлексіўнасць [1, с. 11]. Яны ігнаруюць, аднак, той момант, што рэфлексіўныя акты, здзейсненыя ў сферы філасофскага мыслення, істотным чынам адрозніваюцца ад рэфлексіі матэматыкаў, фізікаў і прадстаўнікоў іншых галін навукі і практыкі, адрозніваюцца менавіта сваёй засяроджанасцю на раскрыцці фундаментальнай структуры чалавечай дзейнасці.)

Наяўнасць (у філасофскім пазнанні) рэфлексіўна-крытычнага сегмента, на ўзроўні якога выяўляюцца і аналізуюцца найглыбейшыя падставы культуратворчасці, з'яўляецца грунтоўнай умовай плённых дыялагічных стасункаў паміж філасофскімі і, адпаведна, культурнымі традыцыямі: скіраваны супраць дагматычнага тэарэтызавання, ён руйнуе сам базіс дагматызму, выключаючы згульні галоўнага ворага дыялагічных зносін. Філасофская праца, аднак, не вычэрпваецца крапатлівай крытычнай праверкай ключавых ідэй пэўнай канцэпцыі і скіраваных супраць яе тэарэтычных атак. Дадзеная праверка арганічна знітавана з разгортваннем зыходных палажэнняў у разгалінаванае сістэматычнае цэлае. Каб згаданае разгортванне здзейснілася ў выглядзе паспяховай філасофскай традыцыі, неабходна перакананне яе носьбітаў у фундаментальнай значнасці выпакутаваных імі ідэй для ўсяго чалавецтва і памкненне змагацца за іх ажыццяўленне. Аднак з пункту гледжання рэалізацыі дыялагічнага прынцыпу ў філасофскім пазнанні і ў сферы міжкультурных дачыненняў гэты аспект выяўляецца як досыць неадназначны і супярэчлівы. Сапраўды, з аднаго боку, ён спрые плённым дыялагічным зносінам, узровень якіх істотна павышаецца, калі іх удзельнікі ўпэўненыя ў сваёй пазіцыі і маюць важкія аргументы на яе карысць. З іншага боку, аднак, згаданая ўпэўненасць можа неўпрыцям дэградаваць (у найгоршым выпадку) да сляпога непрымання іншых поглядаў.

Адзначаную вышэй амбівалентнасць філасофскіх перакананняў (хоць і не ў самым кепскім яе варыянце) у кантэксце ўзаемін розных падыходаў, канцэпцый і – у канчатковым выніку – культурных традыцый можна праілюстраваць пры дапа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мозе прыкладу, узятага з абсягу філасофскай герменеўтыкі. Радыкальны скепсіс, які дэкларуецца Х.-Г. Гадамерам у дачыненні да ўласных поглядаў – («мая дабрачыннасць і мая слабасць выявіліся ва ўнутранай неабходнасці прыняць іншага і яго рацыю» [2, с. 168] (пер. мой. – *А. Б.*) – мае дыялагічныя карані (мысляр указвае на грунтоўную ролю «платонаўскага дыялогу» у яго філасофскім сталенні [2, с. 168]) і, відавочна, скіраваны на разгортванне дыялагічных зносін. Прынцыповы дыялагізм герменеўтыкі, які сягае да адмаўлення ад прэтэнзій на выключную агульназначнасць уяўленняў, ідэй, тэарэтычных праектаў, выпрацаваных суб’ектам герменеўтычнага досведу ў працэсе інтэнсіўных пошукаў, не перашкодзіў, аднак, яе прыхільнікам даць сваім апанентам нагоду для папрокаў у тым, што ўпартая, зацятая артыкуляцыя імі спецыфікі гуманітарных ведаў стварае бар’еры для інтэнсіфікацыі міждысцыплінарных узаемадзеянняў, для разгортвання плённага дыялогу паміж гуманітарыстыкай і прыродазнаўствам, паміж гуманітарнай і прыродазнаўчай культурамі [3].

Найбольш радыкальным і эфектыўным гарантам недапушчэння падобнай сітуацыі можа падацца прапанаваная Р. Рорці «антыфундаменталісцкая» канцэпцыя сутнасці філасофскага пазнання, у якой артыкулюецца (сама)тэрапеўтычны аспект насуперак абгрунтавальнаму (прэтэнзіям філасофіі на абгрунтаванне і канчатковую ацэнку разнастайных чалавечых пазнавальных практык). Адпаведная пераарыентацыя філасофскага мыслення распачалася, на яго думку, у даследаваннях Л. Вітгенштэйна, М. Хайдэгера і Д. Дзьюі, што вяліся ў позні перыяд творчасці кожнага з іх. Сутнасць новых, «рэвалюцыйных» філасофскіх тэкстаў, піянерамі ў стварэнні якіх былі названыя тры (найважнейшыя, паводле меркавання Р. Рорці) мысляры XX ст., у тым, што яны найперш імкнуцца падштурхнуць чытача да самастойнай рэфлексіі над сваёй пазіцыяй, а не прапанаваць (і навязаць) яму новую філасофскую праграму [4, с. 5–7].

Пры такім падыходзе сапраўды разбураецца падмурак, на якім могуць паўстаць смяротна небяспечныя для дыялагічных стасункаў дагматычныя дэвіяцыі ў філасофскіх пазіцыях іх удзельнікаў. Гэта дасягаецца, аднак, занадта дарагім коштам, бо ў выніку разбураюцца падставы не толькі фундаменталісцкай нецярпімасці, але і чэснага інтэлектуальнага спаборніцтва,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

якое здзяйсняецца на ўзроўні аргументаў, іх сур'ёзнага, глыбокага, усебаковага аналізу і якое таксама мае грунтоўнае значэнне для паспяховага разгортвання вялікага філасофскага дыялогу (без памкнення яго ўдзельнікаў пераканаць іншага ў сваёй рацыі ён губляе ўнутранае напружанне і інтэнсіўнасць). У дадзенай сувязі робіцца відавочным, што філасофскае мысленне, каб быць у поўнай ступені дыялагічным, не павінна быць аднабаковым. Справядліва і адваротнае: праз дыялагічныя практыкі яно ў стане прадухіліць магчымыя скажэнні сваёй сутнаснай натуры. Таму дыялагічныя інтэнцыі яго носьбітаў маюць вырашальнае значэнне для яго лёсу.

Такім чынам, грунтоўны дыялагічны патэнцыял філасофіі робіць яе надзвычай важным фактарам дынамізацыі міжкультурных кантактаў. Найбольш эфектыўным чынам ён можа быць задзейнічаны толькі пры ўмове наяўнасці моцнай і няўхільнай волі да яго рэалізацыі. Пры гэтым філасофскае мысленне павінна выступаць у паўнаце і арганічным адзінстве ўсіх сваіх аспектаў – тэрапеўтычнага і абгрунтавальнага, аналітычна-крытычнага і сінтэтычна-дэдуктыўнага. У іншым выпадку яно не здолее дасягнуць узроўню сапраўднай дыялагічнасці ў сваёй уласнай сферы і не зможа выканаць прызначаную яму місію ў абсягу міжкультурных стасункаў.

1. *Deleuze, G.* Qu' est-ce que la philosophie? / G. Deleuze, F. Guattari. – Paris : Éditions de Minuit, 1991. – 208 p.

2. *Gadamer, H.-G.* Die Aufgabe der Philosophie / H.-G. Gadamer // Das Erbe Europas: Beiträge. – Frankfurt am Main, 1989. – S. 166–173.

3. *Höfner, E.* «Kulturwissenschaft denken» : Wissenschafts-Kommunikation und Diskurs-Übersetzung zwischen wissenschaftlichen Disziplinen / E. Höfner // Was sind Kulturwissenschaften? – 13 Antworten / hrsg. von H. D. Kittsteiner. – München, 2004. – S. 99–134.

4. *Rorty, R.* Philosophy and the Mirror of Nature / R. Rorty. – Princeton, New Jersey : Princeton University Press, 1979. – 401 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ